*На працягу стагоддзяў з пакалення ў пакаленне перадаюцца апавяданні пра важнейшыя падзеі, знакамітыя асобы, пра іх подзвігі і вялікія ўчынкі. Таму не здарма, думаючы пра Радзіму, успамінаюцца героі мінулага і сучаснасці, людзі, якія праславілі і ўпрыгожылі край сваімі талентамі і справамі – гэта і вядомыя пісьменнікі, паэты, мастакі, музыканты, грамадскія дзеячы… А ўсё разам гэта гісторыя і ўсё гэта – Радзіма.*

*Наш куток Беларусі – Салігоршчына ўзгадвала шмат таленавітых людзей, дзякуючы якім, пра іх родныя мясціны ведаюць па ўсёй краіне.*



# Леанід Яўгенавіч Якубовіч



21 сакавіка 1948 года ў вёсцы Радкава Салігорскага раёна нарадзіўся таленавіты хлапчук – Леанід Якубовіч. Лёня скончыў Любанскую завочную сярэднюю школу ў 1965 годзе і некаторы час працаваў апературам на пошце вёсцы Чапялі. Потым Леанід уладкаваўся працаваць на другім калійным камбінаце, што побач з роднай вёскай. Адначасова ён вучыцца завочна ў БДУ на факультэце журналістыкі.

Яшчэ ў школе Леанід пачаў складаць вершы. Першы верш «Раніца» надрукаваны ў 1965г. у газеце «Чырвоная змена». З таго часу творы ўсё часцей з’яўляліся ў газетах «Шахцёр», «Голас Радзімы», «Мінская праўда», «За коммунистический труд». Яго вершы ўключаліся ў калектыўныя зборнікі «Рунь» (1970), «Універсітэт паэтычны» (1971).



Леаніда Якубовіча запрашалі на семінары творчай моладзі, ён прыяжджаў у Каралішчавічы, у Дом творчасці, дзе пасябраваў з многімі маладымі паэтамі-равеснікамі. У той час найлепшыя яго вершы з’яўляліся на старонках «Маладосць».

У сакавіку 1970 года Л. Якубовіч узнагароджаны медалём «За доблестный труд». А праз месяц маладога паэта не стала… Ён працаваў на Салігорскім калійным камбінаце. 8 чэрвеня Леанід выйшаў на працу раніцай: першая змена пачыналася а шостай гадзіне. Калі спускаўся з клеццю ў шахту – здарылася бяда. Яму ледзь споўнілася дваццаць два…



Пасля гібелі ў Леаніда засталася паэтычная спадчына. Ведаючы, які патрабавальны ён быў у сваёй творчасці, яго сябры сабралі найбольш адметныя, выспеленыя вершы: «Лёня падумваў аб сваёй першай кнізе. Спадзяёмся, што кніга яго, хоць і невялічкая, будзе выдадзена і дойдзе да чытача. І мы тады зможам яшчэ раз пераканацца, што ў асобе Леаніда Якубовіча страцілі паэта, які сказаў бы ў літаратуры сваё, новае важкае слова». І такая кніга была выдадзена. У 1979 годзе пасмяротна выйшаў зборнік вершаў Леаніда Якубовіча «Я з вамі, вёсны…».

Няўжо прамаўчала світанне  
і травы не стылі ў журбе,  
што неба ў цябе не стане,  
што ў неба не стане цябе?!

*Васіль Жуковіч*

**«Я з вамі, вёсны…»**
***(Літаратурная вечарына да 75-годдзя з дня нараджэння Л.Якубовіча)***

*Уступнае слова:*

Леанід Якубовіч… Як горка, што няма яго з намі, няма яго, таленавітага і шчырага, абаяльнага і чалавечнага чалавека. Вельмі крыўдна, што ён загінуў, што жыццё абарвалася ў юнацтве, у тым узросце, калі кожная тканка арганізма прагне жыцця і руху, калі ўся свядомасць ахоплена духам тварэння.

Але шчымлівы боль страты мяжуе з радасцю: Леанід Якубовіч ёсць, ён працягвае жыць і пасля смерці, ён жыве як паэт, як духоўная спадчына. У мностве паэтычных твораў, якія сёння мае беларуская літаратура, не згубіліся – ззяюць сваёй адметная красою яго вершы, чуецца нам яго усхваляваны юнацкі голас, голас душы і сэрца. Прыгожае духоўнае аблічча паэта ідзе нам насустрач з мінулых гадоў, яно з намі, памагае людзям змагацца за ідэалы. Гэта засведчыў першы і, на вялікі жаль, апошні зборнік вершаў Леаніда Якубовіча «Я з вамі, вёсны…».

*З аўтабіяграфіі Леаніда Якубовіча, напісанай 21 сакавіка 1967 года:*«Я, Якубовіч Леанід, Яўгенавіч, нарадзіўся 21 сакавіка 1948 года ў вёсцы Радкава Салігорскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і калгасніцы Наталлі Несцераўны Понтус. Вучыўся ў Радкаўскай пачатковай школе, потым ў Чапялёўскай сярэдняй школе заканчваў 10 клас і адначасова працаваў паштальёнам».

*Настаўнік матэматыкі Чапялёўскай сярэдняй школы Бараноўскі Міхаіл Васільевіч, які вучыў Леаніда Якубовіча расказвае:* «У школе Леанід вучыўся добра, ветлівы быў з малодшымі і старэйшымі. Паважаў усіх настаўнікаў. Асабліва любіў з усіх прадметаў рускую мову і літаратуру. Ён прымаў актыўны ўдзел у піянерскай і камсамольскай рабоце, часта выступаў на вечарах. Любіў спяваць, танцаваць, чытаць вершы і сам пісаў іх. У сваіх вершах ён імкнуўся паказаць любоў да роднай зямлі, да маці-Радзімы, да людзей, побач з якімі жыў, працаваў, тварыў. Ён радаваўся жыццю, сонцу, ветру, спеламу жыту ў полі. Аб гэтым гавораць радкі з яго верша «Падтэкст не шукайце…».

***«Іду ў жыццё»***



Пасля заканчэння 10-ці класаў Леанід пайшоў працаваць апаратарам у Чапялёўскае аддзяленне сувязі. Працаваў і вучыўся ў 11 класе Любанскай завочнай школы, кансультацыйны пункт якой быў у Чапялях.

Пасля заканчэння школы перайшоў працаваць на другі Салігорскі калійны камбінат.

Пісаць вершы Леанід пачаў у школе. А з 1966 годзе яго творы пачынаюць усё часцей і часцей з'яўляцца на старонках салігорскіх газет «За коммунистический труд», «Шахцёр», а таксама ў рэспубліканскіх перыядычных выданнях.

**«Зайздросьце»**

Зайздросьце, хлопцы, салігорцам –
Маім сябрам і землякам:
Трымалі йспыты па-геройску
На горды тытул гарняка!

Яны, як выклік сутарэнням,
Ідуць дарогамі вякоў,
Чытаюць хітрыя спляценні
Імі пакораных пластоў.

І што там іншыя прафесіі –
Для іх другіх не існуе.
Свае у шахце ёсць прафесары
І аспіранты ёсць свае.

Так, нездарма іх лічаць моцнымі,
Другія гэтак ці змаглі б –
Гаспадарамі паўнамоцнымі
І пад зямлёй, і на зямлі.

Зайздросьце, хлопцы, салігорцам –
Маім сябрам і землякам

***

**«Чалавеку»**

Калі песня не грэе
У мароз і завею, –
Дык нашто твая песня!
Калі рукі ніколі
Не зналі мазоляў, –
Для чаго твае рукі!
Калі сэрца не плача,
Як бязногага ўбачыш, –
То не сэрца, а камень!
Калі вечна на ўзмежку,
Без агню і ўсмешкі, –
Дык нашто і жыццё!

***

**«Жыццё нібы цягнік»**

Жыццё – нібы цягнік...
                    Гады мае – вагоны...
Ўсё болей іх, цягнік усё расце.
Ды сэрца – паравозік неўгамонны,
Разгон бярэ, пастуквае часцей.

І радасна, і крыху страшнавата
Імчаць і захлынацца ад вятроў,
Але імчу... На ўздым бяру заўзята, –
Упартасці пазычыць нат гатоў.

**«Мой кожны дзень у роздуме глыбокім»**

Мой кожны дзень – у роздуме глыбокім,
І кожны дзень мне дорыць адкрыццё.
Жадаю ўбачыць свой паверх высокім
У звонкім доме з назваю: Жыццё.
І не лаўлю шчаслівыя імгненні,
У кожным кроку – тысяча разваг.
Нясу, як сцяг, высокае імкненне,
Нясу, як лозунг, сонца у вачах.
І што ні дзень – чакаюць
                    перамогі,
І я вышэй... А я ўсё вышэй!..
Вядуць прыступкі – цяжкія
                    дарогі –
Да сонца і да мудрасці бліжэй.

***

**«Хоць бывае і цяжка мужчынам»**

Хоць бывае і цяжка мужчынам –
Горкіх слёз не убачыш ніколі.
Хіба толькі пралягуць маршчыны,
Як барозны ад плуга на полі.

Толькі поле шуміць ураджаем,
А маршчыны глыбеюць з гадамі.
І на твары, як след адчаю
І як боль, – маршчыны вузламі.

Не, не плачуць наўзрыд мужчыны,
Толькі зубы сціскаюць ад болю,
Ды кладуцца барозны-маршчыны,
Заараць іх нельга ніколі.

***

**«Іду ў жыццё»**

Адным – каб вецер, каб дарогі,
Каб неба шыр над галавой,
І не бяда, што шмат трывогі,
Што вечна ў сэрцы неспакой.

Любую плынь бяруць іх вёслы, –
Плывуць і не клянуць раку...
Люблю людзей з падобным лёсам,
Люблю, хто з сонцам – за руку.

Другім жа трэба ціш, утульнасць,

Жыццём маім нагружаны вагоны,
Адказна, бо жыццём жа, як-ніяк...
Так хочацца, прымчаўшыся да скону,
Убачыць, што цягнік – не паражняк.

Надзьмуты ветразь – не для іх;
Жывуць, дрымотаю атулены,
Ў бярлогах модненькіх сваіх.

А я – не так... А мне – каб сонца
Ды песень радасны прыбой!..
Не для мяне затокі сонныя;
Я з вамі, вёсны, вам я свой!

## ***«О Беларусь! Старонка дарагая, Мне без цябе – як дрэву без вады…»***

Леанід пісаў няшмат. І на гэта былі прычыны. Па-першае, ён быў вельмі патрабавальны да сябе, і вершы даваліся яму, відаць, нялёгка. Па-другое, было вельмі мала часу, бо Лёня працаваў, вучыўся завочна на філалагічным факультэце ўніверсітэта, прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, дапамагаў дома матулі. Але тое, што ён пісаў, было ўсё больш дасканалым, зрэлым.

**«Споведзь»**

О, добрыя, ціхія хаты –
Калыскі вясковых хлапцоў!..
Люлялі калыскі багата
І казак, і цёплых сноў.

Люлялі, ды мы ўцякалі
Насустрач нязведанным дням,
А вы ўсё чакалі, чакалі…
Чакалі і верылі нам.

І мы, наглытаўшыся пылу
Далёкіх і цяжкіх дарог,
Вярталіся… Большае сілы,
Як ступіш на родны парог.

Ды зноў, адпачыўшы, казалі:
«Бывай, родны кут і гай!»
А вы ўсё чакалі, чакалі,
Каб зноўку пачуць: «Бывай!..»

**«Ідуць калоны»**

Мая Радзіма! Сёння не пазнаць
Тваіх прасторных вуліц і палацаў.
Ідуць калоны, песнямі звіняць
Аб радасці, аб шчасці і аб працы.

Ідуць калоны… Сонца ў руках –
Снягоў гарачых сонца трапяткое,
Яно заўсёды будзе у вяках
Нязгаснае, і вечнае, й жывое.

Ідуць калоны… Вуліцы – бы пульс,
Гарачы пульс Кастрычніцкага свята!
Яны ідуць, бо верны гэты курс,
Што Ленінскаю партыяй узяты!

***Вяртайся сюды, да святога парога:***
***Адсюль твой пачатак і тут твой працяг.***



Жывучы ў бясконцых клопатах, дбаючы не толькі пра ўласнаю будучыню, а пра тое, каб ужо цяпер трошкі лягчэй жылося старой спрацаванай матулі, хлопец навучыўся здольваць неспрыяльныя абставіны, навучыўся мужнасці, не здрадзіўшы арганічна уласцівай яго душы пяшчоце. У вершы «Жаданне» Л.Якубовіч пісаў:

Я жыццё сваё хацеў бы бачыць
Гэткім простым, як матулі рукі,
Рукі, што спазналі ўсе нястачы,
Ўсе зямныя радасці і мукі.

Не жадаю, каб было іначай,
Бо тады гады – пустыя гукі…
Я жыццё сваё хацеў бы бачыць
Неспакойным, як матулі рукі.

Наталля Несцераўна, маці Леаніда, успамінае: «Дома Лёня быў апора. Я за ім і жыла. Сам гатаваў. Калі я хварэла, ён, а яму прыходзілася чытаць свае вершы, выступаць, пісаў: «Мамачка, не трудзіцеся цяжка, я прыеду – ўсё зраблю». Што за сын быў. Які быў добры. Такі быў гаспадарлівы.»

**«Час вылечвае сэрца раны»**
Час вылечвае сэрца раны,
З годам кожным слабее боль,
Нават сны ў сівых ветэранаў
Ўсё аб чымсьці спакойным больш.

Гоіць час чалавечыя раны,
Шчасце сніцца ў спакойных снах…
Толькі ў маці, ссівелай рана,
Боль заўсёды ў сініх вачах.

…Адпраўляла з надзеяй, верыла:
Два сыны да яе крыла
З перамогай жывымі вернуцца…
Перамога ж адна прыйшла.

Ночы цяжкія… Вочы матчыны
Часта ночы зусім не спяць.
Мо бяссоннем? Ды не – гарачым
Болем маці яны гарэць!

**«Успамін»**
Хлеб у хаце!..
Пахучым сонцам
Цёплы бохан з покуці свеціць...
Мы сягоння рады бясконца,
Мы сягоння – райскія дзеці.

Ды ў маці маршчын не меншае,
А ў маці скрозь смех – слязінкі,
Бо апошняя радасць першая,
Бо няма ні адной мучынкі.

Толькі добры жнівень замесіць
З ураджаю новага радасць,
А да жніўня – нягод завеса,
А да жніўня шчэ хмары з градам.

Але сёння свята ў хаце,
Мы шчаслівыя з братам меншым:
Елі хлеб, што спякла нам маці!
Елі хлеб, на слязах замешаны...

***

**«Нічога няма цяплей»**

Нічога няма цяплей
За рукі матуліны,
Нічога няма ласкавей
За рукі матуліны.

Калыска найлепшых сноў –
Рукі матуліны.
Вярнейшая ў свеце любоў
Рук матуліных.
…О рукі, рукі матуліны!

***

**«Мацярынскі наказ»**

Якою далёкай ні будзе дарога,
Якім бы шырокім ні здаўся прасцяг, -
Вяртайся сюды, да святога парога:
Адсюль твой пачатак і тут твой працяг.

***Жыву надзеяй на спатканне,***
***Таму і веру новым дням.***

Среди миров, в мерцании светил
Одной Звезды я повторяю имя...
Не потому, чтоб я Ее любил,
А потому, что я томлюсь с другими.

И если мне сомненье тяжело,
Я у Нее одной ищу ответа,
Не потому, что от Нее светло,
А потому, что с Ней не надо света.

(*Иннокентий Анненский «Среди миров»)*

…На вуліцы ноч. Цікаюць ходзікі… пад гэтую аднастайную мелодыю мне добра сядзець, думаць аб табе, успамінаць цябе.

Я толькі што прыйшоў з работы – выдаўся даволі цяжкі працоўны дзень. Не змог пабачыць цябе сёння і вось пішу табе, пішу аб табе і аб сабе. Гэта – мая сустрэча з табой… я трымаю твае рукі, заглядваю ў твае вочы, цалую твае адданыя вусны. Мне хораша з табой. Я не адчуваў сябе яшчэ так ніколі. Паузбоч праходзіць усё: і гэтая людская мітусня, і іх клопаты, іх трывогі і радасць. Навокал няма нікога – толькі ты і я.

Мы трымаемся за рукі – ТЫ і Я. А гэта не рукі. Не. Так груба назвалі промні пяшчоты незвычайнага сонца, якое нарадзілі мы. Яго не бачыць і не адчувае ніхто.

Мы трымаемся за рукі – ТЫ і Я. Зямляне назвалі б гэта танцам, танцам шчасця. Якія смешныя яны, зямляне! Гэта не танец, не. Гэта – каханне…

Слухай… ты чула?! Якая светлая музыка… Не, гэта не танец. Гэта каханне…

Цікаюць ходзікі…

На твае косы асыпаюцца зоры. А вусны твае шэпчуць мне… Гэта каханне…

… На вуліцы ноч. Восеньская – у меру халодная, у меру цёплая.

Цікаюць ходзікі… І вельмі прыемна слухаць і адчуваць ціканне гэтых ходзікаў. Бо гэта не проста ходзікі… – гэта ходзікі майго і твайго кахання. І наогул нашага шчасця.

Дык няхай жа для ўсіх цікаюць вось такія – чароўныя – ходзікі!!!

**«Каханне»**
Кос тваіх вясновыя струменні,
Рук тваіх ласкавае цяпло…
Да мяне ішло ўсяго імгненне,
Да мяне стагоддзямі плыло
Пачуцця святога азарэнне,
Чалавецтва светлае вясло.

Грані часу ў сонцы раставалі,
Раставала сонца у вачах.
Шчасце мы пілі – не выпівалі,
Захліснуўшы рукі на плячах.

І апошнім сполахам сумлення
Адплыло і згасла небыццё,
З пачуцця святога азарэннем
Пазнавалі сутнасць і жыццё.

Рук тваіх ласкавае цяпло,
Чалавецтва светлае вясло…

***

**«А я ўсё чакаў»**
А я ўсё чакаў, калі прыйдзе яна –
Усмешкі тваёй вясна.
У вочы твае ўсё глядзеў я
І цешыў сябе надзеяй,
Што холаду сінь густая
Нарэшце растане, растане!
Я мудра чакаў, што прыйдзе яна –
Усмешкі тваёй вясна.

**«Між ціхіх ліп, між звонкіх сосен»**
Між ціхіх ліп, між звонкіх сосен
Ў зялёны май пайшлі ўдваіх.
Ім травы ногі шчодра росяць,
І ноч для іх, для іх адных.

Не трэба сцежак пратаптаных –
Вясна гасцінцам пралягла.
Прыкрыла ночка закаханых
Пяшчотай сіняга крыла.

Вянок вянчальны – неба ў зорах,
А маладзік – вясёлы сват.
Ім падарункі – кветак мора,
І пошум дрэў, як спеў дзяўчат.

Рука ў руцэ… І сэрца к сэрцу…
І шчасце вусны п’юць і п’юць…
Вясельным май у нас завецца,
Шчаслівым май у нас завуць!

***

**«Ты толькі ў вочы зазірні»**
«…Ты толькі ў вочы зазірні!»
А ў іх адчай дрыжыць
Слязьмі на вейках чысціні,
А ў іх адчай крычыць!

О лекі! Лекаў не знайсці,
Тут неруш – свет душы,
І ў гэты неруш не прайсці
Па сцежках слоў чужых…

«…Ты толькі ў вочы зазірні!»



Загінуў паэт… пасля смерці засталася новая – пад старой бярозай хата, пабудаваная і яго рукамі.

Застаўся малады сад, пасаджаны ім пад вокнамі гэтай хаты.

Засталіся сябры, якіх ён любіў і якія любілі яго.

Засталіся сабраныя ім кнігі.

Засталіся напісаныя ім вершы.

І ўсё ж ён з намі – крыху наіўны, часцей задумліва-асцярожны, смешны і сур’ёзны. Вазьміце ў рукі яго кнігу «Я з вамі, вёсны…», адкрыйце яе – ён зробіць крок насустрач...

Кніга гэтая дарагая нам. Яна вучыць нас жыць, як належыць чалавеку, які любіў сваю Радзіму, свой народ, сваё савецкае жыццё.

**Рэкамендуем правесці мерапрыемствы, прысвечаныя 75-годдзю з дня нараджэння Леаніда Якубовіча:**

- «На ўзлёце мары»: *літаратурны вечар;*
- «22 вясны Леаніда Якубовіча»: *творчы партрэт;*
- «Неадкрытыя зоркі паэта»: *вечар паэзіі;*
- «Застаўся жыць у вершах»: *гутарка-развага па кнізе* «Я з вамі, вёсны…»;
- «З любоўю і даверам да людзей»: *гутарка-знаёмства з творчасцю;*
- «Шлях да майстэрства, шлях у паэзію»: *вечар-партрэт;*
- «Памятаем і чытаем: паэт Леанід Якубовіч»: *агляд творчасці.*

## Памяці Леаніда Якубовіча

*Ніл Гілевіч*

**Неадкрытыя зоркі паэта**

Ён загінуў трагічна.
З ім разам загінулі мары і думы,
Якія ніколі не зробяцца песнямі, -
Нерасцвілыя кветкі,
Якія ніколі старой адзінокай матулі
Не будуць паднесены;
Неадкрытыя зоркі,
Якімі ніколі пад полагам неба
Каханая не залюбуецца;
Каласы неналітыя,
Што ніколі не popстануць галоднаму
хлебам…
Нішто ўжо не збудзецца!
Недарэчная, страшная смерць.
Ні змірыцца, ні зразумець.
І няма да каго
Закрычаць, запытацца: за што?
Ну за што –
Калі гэтак прыгожа
Ён марыў пра шчасце на свеце?..
Вось пайшоў ёе ад нас –
І яго каласоў
Не даспеліць ніхто.
Яго зорак ніхто не адкрые,
Яго кветак ніхто не расквеціць.

***

*Віктар Ярац*

Пэўна, адтаго, што ў многіх вершах
аўтараў са славаю і без
салаўі пладзіліся бязгрэшныя
і ружовы бэз у вочы лез, –
ты пайшоў, маўклівы і павольны,
хоць любіў птушыны тарарам,
у глыбіні, дзе замест столі –
солі скамянелая гара.
І калі заканчвалася змена,
клець плыла шахцёрская да зор,
стомлена ты вёз наверх, як веру,
свой рабочы верш пра Салігорск.
І не ведаў большае падзякі,
калі хлопцы ў робах гарнякоў
пазнавалі саляныя знакі
у радках нявыдуманых слоў.
У глыбіні, дзе замест столі –
солі нездабытыя пласты,
ты пайшоў паходкаю павольнай –
незахвалены
і малады…

***

*Анатоль Крывіцкі*

Чэрвень, чэрвень, травы ў росах золкіх,
А за вёскай чорныя капры.
Адцвілі ці зацвітаюць смолкі,
А ісці не больш вярсты за тры.

Пачакай над полем жаўруковым,
Прыпыні той недарэчны лёс,
Паглядзі – ў блакіце васільковым
Промень ласку першую данёс,

Скарачаецца жыцця адлегласць, –
Хоць дарогі жорсткай не відно.
Беззваротная сцяжынка легла,
А туман – хаўтурным палатном.

Ныюць рукі той глыбіннай соллю,
Ад якой у славе Салігорск.
Паглядзі, над Радкавам таполі
Прама мецяць да нябесных зор.

...Клець ляціць, ды здрыганецца толькі
Пад няўцямнай сілаю капроў.
А ля хаты – водар ліпы волкі
Гаркатою маладых лісткоў.

*Васіль Жуковіч*

Чакалася сонца ў сінечы,
звінела ў росах трава,
і аб задушэўным нечым
жаўрук абяцаў спяваць.

І зноў аддалялася вёска.
Світанне збіралася ледзь,
у белых агнях Салігорска
чакала шахцёрская клець.

А я з паэтычнай арбіты
чакаў, Лёня, вершаў тваіх.
Я ведаў, што іх не рабіў ты –
у сэрцы выношваў іх.

О, як непадкупна і смела
ішоў ты да вышыні!
Яна, вышыня твая светлая,
пачатак вяла з глыбіні.

Няўжо прамаўчала світанне
і травы не стылі ў журбе,
што неба ў цябе не стане,
што ў неба не стане цябе?!

***

*Марыя Баравік*

На ўзлёце мары,
на пачатку гоняў
Пераблытана бядой
твая пара.
Помнікам табе –
у поля на далоні
З недраў матухны
здабытая гара.
Ціхія і мудрыя
стаім перад гарою
Вечных чалавечых
думак і пакут.
Палявымі росамі
з першаю зарою
Плача па табе
твой родны кут.
Абуджаюць гоні
твае песні, Лёня.
Час няспынны

не накліча забыццё.
І тваё імгненне
зноў, як на далоні, –
З памяці балючай
здабытае жыццё.

***

*Яўгенія Янішчыц*

**Салаўі**

Не ведала, не ведала, калі…
А думала
Зялёным тым прадвеснем:
Калі мае змоўкнуць салаўі,
То за тваімі –
Столькі многа песень!
Але што можа стацца на зямлі
Такою вось
Высокаю парою:
Спяваюць,
Не змаўкаюць салаўі
Над памяццю,
Над песняю тваёю.

***

*Ніна Мацяш*

Зноў ты побач…
«Дзень добры, Ніна!
Нешта ты, сяброўка, прымоўкла…
Як там маецца вёска Нівы?
Што пяе канал тваім вокнам?
Так даўно не пісаў – даруй мне...
Проста час нейкі быў няпэўны.
Несці радасць люблю, як дарунак, –
А з нягоды – нягода, пэўна ж?
А было не зусім вясёла:
То адно не ў лад, то другое.
Людзі, ведаю, не анёлы,
Толькі гэта сэрца не гоіць.

Як дзікун да агню святога,
Да сустрэчы той невыпадковае,
Дзе звяло нас СП ці богам!
Што чуваць у сяброў нашых, Ніна?
Мо пашчасціць – летам збярэмся…
Нізка кланяюсь вёсцы Нівы
І тваёй любімай бярэзінцы…»

…За акном бяззорна і нема,
Ноч – як чорная штольня шахты,
Дзе разбілася яснае неба
У тваю апошнюю вахту.

Вёска Нівы спраўляе вяселлі,

***

*Юрка Голуб*

Хацелася завеям
Гуляць за медны грош.
Жылося нам не горш.
Каб сумна, то не вельмі.
І снежкаю дзяржавай
Вазілі пошту днём
У сумках з моцным дном
Па вёсках і заставах.
І коні, як выдома,
Спяшаліся на шлях,
Каб змораным пасля
Ды завідна дадому.
Зіма спрыяла душам
І жыту на палях.
Задумы на пасля
Хавала пад падушку.
І хай мяне бог крые,
Што маю на руках
Не права наракаць,
А твой дазвол на крылы.
Адкладваецца ў розум
Зіма і лістабой.
Радзіма над табой –
Балючаю бярозай.

Можа, трэба было б іначай?
Можа, трэба не так хваравіта?
Ды, відаць, мне ўжо лёсам прызначана
Подласць біць і быць подласцю бітым.
Я, здаецца, завёў пра сумнае…
Чапялою мяне, чапялою!
…Знаеш, Нін, толькі хмара насунецца,
Закружацца сняжынкі роем –
І ўспамінамі ўжо прыкованы,
Вёска Нівы спраўляе радзіны.
Што ніколі яе аселіцы
Больш не стрэць цябе –
страшна, дзіка…

Перадушаны крык маўчаннем
У душы – як сізіфаў камень.
Ў кожнай пошце няўцямна вачамі
Ад цябе ліста ўсё шукаю…

Творы Леаніда Якубовіча:

1. Якубовіч, Л. «О Беларусь!»; «Мацярынскі наказ»; «Жаданне»; «Чалавеку»: вершы / Леанід Якубовіч // Шахцер. – 2000. – 6 чэрвеня.
2. Якубовіч, Л. Вершы / Леанід Якубовіч // Калійшчык Салігорска. – 1994. – 2 ліпеня.
3. Якубовіч, Л. Вершы / Леанід Якубовіч // Універсітэт паэтычны. – Мінск, 1971. – С. 219-221.
4. Якубовіч, Л. Горада я лепшага не знаю: верш / Леанід Якубовіч // Салігорскі веснік. – 1999. – 12 чэрвеня.
5. Якубовіч, Л. Гэта каханне...: апавяданне / Леанід Якубовіч // Салігорскі веснік. – 1999. – 12 чэрвеня.
6. Якубовіч, Л. Зайздройсьце: верш / Леанід Якубовіч // Салігорскі веснік. – 1993. – 9 мая.
7. Якубовіч, Л. Лірыка: верш / Леанід Якубовіч // Шахцер. – 1968. – 2 кастр.
8. Якубовіч, Л. Навагодні прыём у Дзеда Мароза: верш / Леанід Якубовіч // Шахцер. – 1968. – 1 студзеня.
9. Якубовіч, Л. О Беларусь! Старонка дарагая...: верш / Леанід Якубовіч // Строитель Солигорска. – 2011 . – 2 сентября. – С.5.
10. Якубовіч, Л. Пад месяца вечным святлом: верш / Леанід Якубовіч // Шахцер. – 1968. – 6 чэрвеня.
11. Якубовіч, Л. Палескі край: верш / Леанід Якубовіч // Шахцер. – 1968. – 10 снежня.
12. Якубовіч, Л. Снег успамінаў: верш / Леанід Якубовіч // Шахцер. – 1968. – 29 мая.
13. Якубовіч, Л. Чалавеку: верш / Леанід Якубовіч // Салігорскі веснік. – 1993. – 19 мая.
14. Якубовіч, Л. Шлях да майстэрства, шлях у паэзію: вершы / Леанід Якубовіч // Шахцер. – 1968. – 23 кастрычніка.
15. Якубовіч, Л. Я з вамі, вёсны...: вершы / Леанід Якубовіч. – Мінск: Маст. літ., 1979. – 80 с.

## Аб жыцці і творчасці Леаніда Якубовіча:


1. Афанасьеў, А. Застаўся жыць у вершах / А. Афанасьеў // Шахцёр. – 1988. – 25 чэрвеня.
2. Баравік, М. Памяці Леаніда Якубовіча / М.Баравік // Шахцёр. – 2000. – 6 чэрвеня.
3. Вальшакова, Ю. Паэт з шахты / Юлія Вальшакова // Сельская газета. – 2014 . – 5 апреля. – С. 29.
4. Жуковіч, В. Памяці Лёні Якубовіча / В. Жуковіч // Калийщик Солигорска. – 1990. – 26 января.
5. Зенава, Г. Крылы-вершы Леаніда Якубовіча/ Галіна Зенава // Роднае слова. – 2008 . – №11. – С. 27-29.
6. Зубарева, Н. Навсегда остался молодым / Наталья Зубарева // Строитель Солигорска. – 2013 . – 19 апреля. – С. 5.
7. Кур'ян, А. Два вершы з аўтографам / А. Кур'ян // Калійшчык Салігорска. – 1994. – 11 чэрвеня.
8. Леанід Якубовіч // Беларускія пісьменнікі (1917-1990): даведнік / склад. А.К. Гардзіцкі. – Мінск: Маст. літ., 1994. – С. 632.
9. Леанід Якубовіч: да 40-годдзя з дня нараджэння // Шахцёр. – 1988. – 22 сакавіка.
10. Масакоўскі, У. 22 вясны Леаніда Якубовіча / Уладзімір Масакоўскі // Лидер-пресс. – 2015 . – 15 июля. – С. 5.
11. Масакоўскі, У. А каханне было такім шчырым...: з успамінаў пра паэта Л.Якубовіча / Уладзімір Масакоўскі // Калийщик Солигорска. – 1991. – 2 августа.
12. Масакоўскі, У. У вялікім сяброўстве / Уладзімір Масакоўскі // Строитель Солигорска. – 2014 . – 14 февраля. – С. 5.
13. Мацюкевіч, М. На узлёце мары: жыццё і творчасць паэта Леаніда Якубовіча (1948-1970) / М. Мацюкевіч // Роднае слова. – 1998 . – №3. – С. 173-178.
14. Мінюковіч, В. Памятаем і чытаем: паэт Леанід Якубовіч з в. Радкава Салігорскага раёна /В. Мінюковіч // Шахцёр. – 2003. – 28 сакавіка.
15. О Беларусь! Старонка дарагая!: да 40-годдзя з дня нараджэння Леаніда Якубовіча // Калийщик Солигорска. – 1988. – 18 марта.
16. Паўлюц, Н. «Я з вамі весны!..»/ Наталля Паўлюц // Строитель Солигорска. – 2009 . – 3 июля. – С. 5.
17. Чаркоўская, В. У бібліятэцы ўспаміналі земляка- паэта / Варвара Чаркоўская // Лидер-пресс. – 2013. – 10 апреля. – С. 8.
18. Якубовіч Леанід // Беларускія пісьменнікі: біябібліягр. слоўн.: У 6 т./ пад рэд.А.В. Мальдзіса. – Мінск: БелЭН, 1993. – Т. 6. – С. 485-486.

Складальнік: Андык Н.М.

Рэдактар: Аліхвер Л.В.

ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка»

Аддзел бібліятэчнага маркетынгу